# З наступаючым Новым годам!





ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 39 (172) | Субота, 29 снежня 1973 года. | Газета выходзіць з верасня 1969 года раз у тыдзень | Цана 2 кап.


## ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ
### АБ ПЛЕНУМЕ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

У Мінску 26 снежня 1973 года адбыўся XII Пленум Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі.

Пленум абмеркаваў вынікі снежаньскага (1973 года) Пленума ЦК КПСС і задачы партыйных арганізацый рэспублікі.

На Пленуме ЦК КПБ выступіў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар Цэнтральнага Камітэта КП Беларусі таварыш П. М. Машэраў, які выклаў задачы партыйных арганізацый рэспублікі ў святле рашэнняў снежаньскага (1973 года) Пленума ЦК КПСС, палажэнняў і вывадаў, змешчаных у прамове Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева на гэтым Пленуме.

Выказваючы агульную думку ўсіх камуністаў і працоўных рэспублікі, пленум ЦК Кампартыі Беларусі цалкам і поўнасцю адобрыў рашэнні снежаньскага Пленума ЦК КПСС, палажэнні і ўказанні, змешчаныя ў прамове таварыша Л. І. Брэжнева на Пленуме і прыняў іх да няўхільнага кіраўніцтва і выканання.

Пленум ЦК КПБ выказаў аднадушнае адабрэнне плённай, творчай дзейнасці ЦК КПСС, яго Палітбюро, асабіста Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева па ажыццяўленню рашэнняў XXIV з'езда партыі ў галіне ўнутранай і знешняй палітыкі.

Пленум намеціў першачарговыя народнагаспадарчыя задачы і шляхі іх вырашэння ў прамысловасці і будаўніцтве, адобрыў распрацаваныя бюро ЦК КПБ і Саветам Міністраў БССР неадкладныя меры па далейшай інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці рэспублікі, якія забяспечваюць выкананне заданняў і абавязацельстваў на 1974 год, ажыццяўленне якасна новага кроку ў развіцці ўсіх галін сельскай гаспадаркі.

Пленум запэўніў ЦК КПСС у тым, што партыйныя арганізацыі, камуністы, камсамольцы і ўсе працоўныя рэспублікі прыкладуць усе свае сілы, веды і вопыт, энергію і волю для ажыццяўлення рашэнняў снежаньскага Пленума ЦК КПСС, велічных планаў камуністычнага будаўніцтва, распрацаваных XXIV з'ездам партыі.

Пленум заслухаў інфармацыю Гомельскага абкома КПБ аб ходзе абмену партыйных дакументаў у абласной партыйнай арганізацыі (дакладчык — першы сакратар Гомельскага абкома КПБ В. А. Гвоздзеў).

Па абмеркаваных пытаннях прыняты адпаведныя пастановы.

## «САЮЗ-13»: ПАЛЁТ ЗАВЕРШАН

### ПАВЕДАМЛЕННЕ ТАСС

26 снежня 1973 года пасля заканчэння работ на борце карабля «Саюз-13» касманаўты таварышы Клімук Пётр Ільіч і Лебедзеў Валянцін Вітальевіч вярнуліся на Зямлю. У 11 гадзін 50 мінут па маскоўскаму часу спускаемы апарат касмічнага карабля «Саюз-13» зрабіў мяккую пасадку на тэрыторыі Савецкага Саюза за 200 кіламетраў на паўднёвы захад ад горада Караганды.

Медыцынскае абследаванне паказала, што стан здароўя касманаўтаў пасля прызямлення добры.

У ходзе васьмісутачнага арбітальнага палёту праведзены разнастайныя навукова-тэхнічныя даследаванні і эксперыменты.

З дапамогай сістэмы тэлескопаў «Арыон-2» атрыманы спектаграмы зорак у розных сузор'ях ва ўльтрафіялетавым дыяпазоне.

У час палёту праводзіліся спектраграфаванне і шматзанальная здымка ўчасткаў зямной паверхні з мэтай вывучэння прыродных утварэнняў на тэрыторыі Савецкага Саюза ў інтарэсах народнай гаспадаркі.

Па праграме медыка-біялагічных даследаванняў з выкарыстаннем апаратуры «Ляўконія» вывучаліся асаблівасці кровазвароту галаўнога мозгу ў розных стадыях перыяду адаптацыі. Ва ўмовах бязважкасці з дапамогай сістэмы «Аазіс-2» даследаваліся магчымасці атрымання бялковай біямасы.

Пры выкананні навуковых эксперыментаў адпрацоўваліся ўдасканаленыя прыборы і метады арыентацыі.

Палёт карабля надзейна забяспечваўся сродкамі наземнага каманднa-вымяральнага комплексу. Даныя, атрыманыя ў ходзе палёту, апрацоўваюцца і вывучаюцца.

## КАЛІ ЛАСКА, НА НАВАГОДНЮЮ ЁЛКУ!

**Сёння, 29 снежня, у фае актавай залы адбудзецца Навагодні баль студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта.**

**Уваход па запрашальных білетах.**

**Пачатак — у 20 гадзін.**

* * *

**31 студзеня ў фае актавай залы з 11 гадзін пачнецца Навагодні ранішнік для дзяцей супрацоўнікаў універсітэта. У святочнай праграме выступяць Дзед Мароз і Снягурачка.**

# СА СЛАЎНЫМ ЮБІЛЕЕМ!

**Першага студзеня 1974 года — знамянальная дата для факультэта фізічнага выхавання: спаўняецца 25 гадоў з дня яго заснавання.**

За чвэрць стагоддзя факультэтам фізвыхавання ў складзе былога педінстытута імя Чкалава і ўніверсітэта падрыхтаваны сотні высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія цяпер з поспехам вядуць педагагічную, трэнерскую і навуковую работу. Многім юнакам і дзяўчатам гэты факультэт адкрыў дарогу ў вялікі спорт. Яны дастойна абаранялі і абараняюць гонар нашай ВНУ, горада, вобласці, рэспублікі на самых разнастайных спаборніцтвах. Гордасцю факультэта з'яўляюцца многія яго выхаванцы, сярод якіх ёсць алімпійскі чэмпіён, чэмпіёны свету, Еўропы, краіны, БССР.

На факультэце склаўся калектыў высокакваліфікаваных выкладчыкаў і трэнераў, якія здольны замацоўваць і памнажаць дасягнутыя поспехі.

Горача вітаем усіх выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў факультэта фізвыхавання са слаўным юбілеем! Жадаем вам і ў будучым рыхтаваць выдатных работнікаў фізічнай культуры, высока трымаць сцяг савецкага спорту!

**РЭКТАРАТ, ПАРТКОМ, МЯСЦКОМ, КАМІТЭТ ЛКСМБ, ПРАФКОМ.**

# УНІВЕРСІТЭТ ПАШЫРАЕ ГАРЫЗОНТЫ

*Інтэрв'ю з рэктарам універсітэта, доктарам фізіка-матэматычных навук* Б. В. БОКУЦЕМ



**— Барыс Васільевіч, скажыце, калі ласка, чым быў знамянальны для ўніверсітэта 1973 год?**

— Трэці год дзевятай пяцігодкі з'яўляецца асабліва прыкметнай вяхой у станаўленні нашага ўніверсітэта. Ужо не толькі на стацыянарным, але і на завочным аддзяленні поўнасцю закончаны пераход з педінстытуцкай на ўніверсітэцкую вучэбную праграму. Многае зроблена па ўкамплектаванню кафедр высокакваліфікаванымі кадрамі. Па конкурсу на вакантныя пасады абраны тры доктары і каля 15 кандыдатаў навук, дацэнтаў. Сярод іх — доктар фізіка-матэматычных навук В. П. Рвачоў, доктар філасофскіх навук М. І. Рубцоў, доктар эканамічных навук С. А. Кім і іншыя вучоныя.

Сёлета загадчык кафедры псіхалогіі і педагогікі І. Ф. Харламаў зацверджаны ў вучонай ступені доктара педагагічных навук, восем выкладчыкаў універсітэта паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

Добры падарунак да гэтага Новага года зрабілі нам будаўнікі. Яны здалі ў эксплуатацыю выдатны вучэбна-лабараторны корпус, у якім пачнуцца заняткі з другога семестра. Цяпер значна палепшацца ўмовы для правядзення ва ўніверсітэце ўсяго вучэбна-выхаваўчага і навуковага працэсу. У новым корпусе ўстанаўліваецца электронна-вылічальная машына «Мінск-32», на ўзроўні сучасных патрабаванняў абсталёўваюцца многія лабараторыі. Гэта дазволіць якасна палепшыць надрыхтоўку будучых спецыялістаў.

У 1973 годзе ва ўніверсітэце адкрыты яшчэ дзве кафедры — арганізацыі механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі і галіновых эканомік. Абедзве гэтыя кафедры абслугоўваюць эканамічны факультэт.

**— У якой меры вырашана праблема з вучэбнай плошчай пасля ўводу ў эксплуатацыю новага корпуса?**

— Толькі напалавіну. Таму мы зацікаўлены, каб як мага хутчэй пачалося будаўніцтва новага ўніверсітэцкага гарадка ў раёне Валатавы. Гіправуз СССР (г. Масква) ужо распрацаваў тэхнічны праект. Ён абмеркаван рэктаратам ГДУ, кіруючымі партыйнымі і савецкімі работнікамі вобласці, вопытнымі будаўнікамі і архітэктарамі Гомеля і рэкамендаван для зацвярджэння.



На здымку вы бачыце макет галоўнага корпуса будучага ўніверсітэцкага гарадка. Ён разлічан на 4875 студэнтаў. У галоўным корпусе будуць размяшчацца гісторыка-філалагічны, эканамічны і механіка-матэматычны факультэты, бібліятэка, вылічальны цэнтр. Тут будуць паточныя аўдыторыі на 300, 200 і 100 чалавек. Актавая зала разлічана на 1200 студэнтаў.

У архітэктурны ансамбль універсітэцкага гарадка ўвойдуць вучэбныя карпусы іншых факультэтаў, інтэрнаты, спартыўныя збудаванні. Яны зоймуць плошчу ў 14 гектараў. Мяркуецца таксама будаўніцтва навукова-даследчых інстытутаў.

**— Калі пачнецца будаўніцтва новага ўніверсітэцкага гарадка!**

— У 1975 годзе. Пажадана, каб будаўніцтва галоўнага корпуса было завершана праз тры гады. А калі вырасце ўвесь універсітэцкі гарадок, у ім будзе вучыцца 14 тысяч студэнтаў.

**— Што яшчэ можна сказаць пра развіццё ўніверсітэта?**

Прадугледжваецца адкрыць новыя кафедры і спецыяльнасці, паглыбіць спецыялізацыю студэнтаў. Для стажыроўкі мы будзем пасылаць іх у вядучыя навуковыя цэнтры краіны. Словам, ставім перад сабой задачу рыхтаваць спецыялістаў самай высокай кваліфікацыі.

**— Барыс Васільевіч, як вядома, вы плённа працуеце ў галіне крышталеоптыкі, да прызначэння на пасаду рэктара загадвалі лабараторыяй крышталеоптыкі Інстытута фізікі АН БССР. Як цяпер Вы сумяшчаеце працу кіраўніка і вучонага?**

— На фізічным факультэце з гэтага навучальнага года 13 студэнтаў спецыялізуюцца па оптыцы і спектраскапіі. У 1974 годзе мяркуецца адкрыць кафедру оптыкі. Тады па новай спецыялізацыі будзе навучацца значна большая колькасць студэнтаў. У народнай гаспадарцы оптыка знаходзіць самае шырокае прымяненне. Яе значэнне цяжка пераацаніць. Патрэба ў спецыялістах гэтага профіля вялікая. Таму я бачу шырокую перспектыву фізічнага факультэта ўніверсітэта ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў па оптыцы і спектраскапіі, у далейшым развіцці гэтай навукі.

**— Вашы пажаданні студэнтам на новы год?**

— Самыя добрыя. Паколькі ў студзені пачынаецца зімовая залікова-экзаменацыйная сесія, дык перш за ўсё хочацца пажадаць на ёй вялікіх поспехаў усім нашым выхаванцам. Вучоба для студэнтаў — гэта галоўнае. Таму абавязак кожнага юнака і дзяўчыны нястомна авалодваць выбранай прафесіяй. Хочацца таксама, каб як мага больш студэнтаў далучалася да актыўнай навукова-даследчай работы, загартоўвалі сябе ў спартыўных секцыях, развівалі свае здольнасці ў гуртках мастацкай самадзейнасці, вызначаліся ў грамадскай дзейнасці.

Ад імя рэктарата, парткома, камітэта камсамола, прафсаюзных арганізацый я горача віншую ўсіх студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта з наступаючым 1974 годам і жадаю, каб для кожнага ён быў шчаслівым і плённым!



Так на макеце выглядаюць чытальная і актавая залы.

# ВЕЧАР ПРАЦОЎНАЙ СЛАВЫ

**Сёлета студэнцкія будаўнічыя атрады нашай краіны адзначалі сваё пятнаццацігоддзе. Вытокі гэтага патрыятычнага руху пачынаюцца з традыцый, якія былі закладзены яшчэ першымі пакаленнямі савецкага студэнцтва. Папярэднікамі байцоў** СБА былі маладыя працаармейцы, сінеблузнікі, юнакі і дзяўчаты, якія будавалі Магнітку, новыя фабрыкі, заводы, гарады, аднаўлялі народную гаспадарку ў пасляваенны час.

І мы па праву можам цяпер ганарыцца, што студэнты нашага ўніверсітэта таксама з'яўляюцца дастойнымі прадаўжальнікамі тых слаўных традыцый. Сёлета, як і ў папярэднія гады, яны з вялікім жаданнем выязджалі на ўдарныя камсамольскія будоўлі, каб унесці свой дастойны ўклад у датэрміновае выкананне заданняў дзевятай пяцігодкі. Мінулым летам СБА ўніверсітэта з гонарам выканалі сацыялістычнае абавязацельства: асвоілі 1 мільён 25,9 тысячы рублёў капіталаўкладанняў. І байцам студэнцкіх будаўнічых атрадаў было аб чым расказаць, аб чым успомніць, калі ў мінулую суботу яны сабраліся ў актавай зале ўніверсітэта на вечар працоўнай славы.

Вечар адкрыў намеснік сакратара парткома Я. А. Семянчук.

З дакладам аб выніках работы мінулага трэцяга працоўнага семестра выступіла сакратар камітэта камсамола Тамара Ільянкова. Яна адзначыла, што першае месца за агульныя паказчыкі працы ў трэцім семестры прысуджана **эканамічнаму факультэту**, другое — **факультэту фізвыхавання**, трэцяе — **механіка-матэматычнаму факультэту**. Гэтыя факультэты ўзнагароджаны граматамі рэктарата, парткома, камітэта камсамола і прафкома.

Сярод будаўнічых атрадаў лепшымі прызнаны: «Амфібія» (камандзір **У. Касабукін**, камісар **М. Саўчанка**), «Узлёт» (камандзір **У. Цімашэнка**, камісар **А. Цімашэнка**), «Універсал» (камандзір **У. Басак**, камісар **П. Волах**). Атрады таксама ўзнагароджаны граматамі.

Самых высокіх узнагарод — Ганаровых грамат ЦК камсамола Беларусі ўдастоіліся лепшыя камандзіры і байцы атрадаў: **У. Фёдараў** (атрад «Шукальнік»), **Р. Дуб** (атрад «Матэматык»), **У. Цімашэнка** (атрад «Узлёт»), **Н. Пяцяры** і **У. Дзюбо** (атрад «Альба»).

На вечары вялікая група студэнтаў была ўзнагароджана граматамі абкома, гаркома і райкома камсамола. Дваццаці лепшым камандзірам і байцам уручаны грашовыя прэміі. Сярод іх — **Б. Кіслякоў, А. Грамыка, А. Белагуб, С. Лапачкін, В. Клявец, Р. Брэль** і іншыя.

Удзельнікі вечара працоўнай славы аднадушна прадэманстравалі сваё імкненне ў трэцім семестры новага, 1974 года дабіцца яшчэ большых здабыткаў на камсамольскіх ударных будоўлях.

Пасля ўрачыстай часткі з канцэртам выступіў вакальна-інструментальны ансамбль механіка-матэматычнага факультэта «Алгарытм».



**На здымку** (злева направа): У. Дзюбо, Н. Пяцяры і У. Басак, якія на вечары працоўнай славы атрымалі ўзнагароды за плённую працу ў студэнцкіх будаўнічых атрадах.

Фота **А. Рудчанкі.**

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, мясцком, камітэт камсамола і прафком горача віншуюць старшага выкладчыка кафедры педагогікі і псіхалогіі Саннікаву Анну Васільеўну, якая напярэдадні новага года паспяхова абараніла дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук.**

